контролирует их расходование. Хуже того, государство может и не предоставить эти средства.

Для установления экономической независимости территориального коллектива исключительно важен вопрос о разграничении государственной и муниципальной собственности. Собственность государства должна иметь “противовес” в виде собственности муниципальной.

***В. І. Шайкоў***

**Полацкі дзяржаўны універсітэт**

# CAMO GRADESHI

Беларусь перажывае сістэмны крызіс. У заняпадзе знаходзіцца прамысловасць, сельская гаспадарка, фінансы, працягвае пагаршацца матэрыяльнае становішча насельніцтва... Звыш 80 працэнтаў жыхароў Полаччыны не задаволены сваім матэрыяльным становішчам, каля 70 працэнтаў – становішчам у Рэспубліцы Беларусь.

*Сацыялагічны цэнтр Полацкага дзяржаўнага універсітэта ў межах сацыяльнага маніторынга **“Улада і людзі”** 20–30 чэрвеня і 20 верасня 1999 года правеў два этапы даследавання. У сацыялагічным апытанні па квотна-прапарцыянальнай выбарцы прынялі ўдзел 2100 жыхароў старажытнай сталіцы Беларусі г. Полацка і аднаго з самых маладых гарадоў краіны Наваполацка (адпаведна 1050 палачан і 1050 навапалачан). Выбарка рэпрэзентатыўная. Камп'ютэрная апрацоўка матэрыялаў палявой часткі даследавання выканана з дапамогай праграмнага пакета SPSS. Даследаванне праведзена пры фінансавай падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў.*

41,9 працэнта навапалачан і 34,4 працэнта палачан бачаць выйсце з зацягнуўшагася крызісу у хутчэйшым стварэнні дзяржаўна-рэгулюемай рынкавай эканомікі. Кожны пяты палачанін і кожны семы навапалачанін аддаюць перавагу існаваўшай да 1985 г. адміністрацыйна сістэме гаспадарання і менавіта праз вяртанне да яе лічаць магчымым вырашэнне існуючых праблем. Дарэчы, на пытанне “ЦІ ЖАДАЛІ Б ВЫ ВЯРНУЦЦА ДА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ЛАДУ ЖЫЦЦЯ, ЯКІ ІСНАВАЎ ДА 1985 г.?” былі атрыманы наступныя адказы (гл.: табліцу 1, паказчыкі ў працэнтах)

*Табліца 1:*

| | ПОЛАЦК | НАВАПОЛАЦК |
|---|---|---|
| Так | 33,8 | 22,9 |
| Хутчэй так, чым не | 15,8 | 15,8 |
| Хутчэй не, чым так | 11,3 | 19,8 |
| Не | 17,4 | 17,7 |
| Цяжка адказаць | 21,6 | 23,8 |

Калі падсумаваць падыходы, то атрымліваецца, што амаль кожны другі палачанін пагаджаецца з тымі перавагамі, якія даваў сацыялістычны лад чалавеку працы ў параўнанні з існуючым сення. У Наваполацку колькасць прыхільнікаў сацыялістычнага ладу – 38,7 працэнта. Звяртае на сябе ўвагу і той момант, што кожны пяты не выказаў сваіх адносін па дадзенаму індыкатару.

Разам з тым толькі 40 працэнтаў жыхароў нашых гарадоў схільны думаць, што праводзімая сенняшнім кіраўніцтвам Рэспублікі Беларусь эканамічная палітыка прывядзе да сацыяльнага ўзрыва, прычым цалкам згодны з такім меркаваннем кожны пяты рэспандэнт.

Разам з тым кожны чацверты новапалачанін і кожны трэці палачанін упэўнены, што ў 2000 г. іх матэрыяльнае становішча павінна палепшыцца, а вось з тым, што яно пагоршыцца – адпаведна 47,0 працэнта і 35,5 працэнта. Амаль кожны трэці жыхар Полаччыны спадзяецца пратрымацца ў 2000 г. на папярэднім узроўні.

А што будуць рабіць жыхары нашых гарадоў, калі становішча ў краіне будзе пагаршацца? Большасць палачан (54,2 працэнта) і навапалачан (61,1 працэнта) спадзяецца на ўласныя сілы і будзе самастойна шукаць шляхі паляпшэння свайго матэрыяльнага становішча (як варыянты разглядаюцца працаўладкаванне па сумяшчальніцтву, прадпрымальніцкая дзейнасць, праца на дачным участку і г.д.).

***В. В. Рымкевич***
**БГЭУ**

# ЭКОНОМИЧЕСКИЕ РИСКИ В ТРАНСФОРМАЦИИ ОТНОШЕНИЙ СОБСТВЕННОСТИ

Отношения собственности характеризуют прежде всего способ соединения работника со средствами производства. Проблема взаимодействия работника и объектов собственности выступает ключе-